*У хроніку культурнага жыцця*

# РАБОТА БІБЛІЯТЭК
## Жнівень 2026

У перыяд летніх канікул у бібліятэках ДУК «Лунінецкая РЦБС» для дзяцей прайшлі розныя мерапрыемствы: гульнявыя пляцоўкі, летнія сустрэчы з цікавымі людзьмі, з кнігай і іншыя мерапрыемствы.

У **філіяле Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** прайшло краязнаўчае падарожжа «Лучше один раз увидеть». Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй горада. Удзельнікі мерапрыемства пачулі легенды, якія расказваюць пра паходжанне назвы горада, успомнілі славутасці горада, пазнаёміліся з апавяданнямі пра землякоў, якімі ганарыцца наш горад. Дзеці прынялі актыўны ўдзел у віктарыне «Мой любимый город», а таксама прагледзелі відэаролік «Мой город».

У **філіяле Лунінецкая цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэка** прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй «Сокровища книжных полок». Для дзяцей была падрыхтавана тэматычная кніжная выстава - Чырвоная кніга Беларусі (рыбы), «Жизнь в солёной воде», «Киты и дельфины», «Глыбокія, моцныя, паўнаводныя» (рэкі Беларусі). Пасля мерапрыемства хлопчыкі з дэталяў канструктара сабралі чыгунку і паравоз. Дзяўчынкі, з набору прыгожых бусін зрабілі для сябе ўпрыгожванні.

У **філіяле Лунінская сельская бібліятэка** прайшлі гучныя чытанні «Книжный мир детства».

Бібліятэкар **філіяла Сінкевіцкая сельская бібліятэка** правяла віктарыну для дзяцей «Угадай сказку».

У **філіяле Палеская сельская бібліятэка** была праведзена гульня-віктарына «Мы ходили по грибы». У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі пазнаёміліся з светам грыбоў, замацавалі веды аб ядомых і неядомых відах. Дзеці размалёўвалі ядомыя і неядомыя грыбы, адказвалі на пытанні віктарыны, удзельнічалі ў гульні «Собери грибы».

Да Міжнароднага дня кнігалюба ў **філіяле Лунінецкая цэнтральная раённая дзіцячая** бібліятэка была праведзена акцыя «Я люблю книги». Юныя кнігалюбы знаёміліся з выставай «9 августа — День книголюбов». На стэндзе «Я люблю читать, потому что…» дзеці пакінулі свае сэрцайкі з водгукамі.

Бібліятэкар **філіяла Багданаўская сельская бібліятэка** правяла пазнавальна-забаўляльную гульню «Лето с книгой». Дзецям трэба было адгадаць галоўных герояў з кніг і аднавіць сапраўдныя назвы казак. Адгадвалі назвы твораў па ілюстрацыі і песні з вядомых мультфільмаў.

У **філіяле Бастынская сельская бібліятэка** прайшла літаратурная гадзіна «Мир книг — в мир детства». У ходзе мерапрыемства чытачы здзейснілі падарожжа ў цудоўны, чароўны, таямнічы і нязведаны Кніжны свет.

Для дзяцей на тэму старонкі любімых казак у бібліятэках ДУК «Лунінецкая РЦБС» прайшлі разнастайныя мерапрыемствы.

У **філіяле гарадская бібліятэка мікрараёна «Сельгастэхніка»** для выхаванцаў сярэдняй групы дзіцячага сада №6 г. Лунінца прайшло тэматычнае мерапрыемства — гульня-віктарына «По русским народным сказкам». У ходзе мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з кніжнай выставай і прачытала казку «Гуси-лебеди». Юныя чытачы з вялікай цікавасцю адгадвалі загадкі пра казачных герояў, а ў завяршэнні сустрэчы паглядзелі тэматычную відэагульню.

У **філіяле Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** прайшла гадзіна дзіцячага чытання «Мы читаем — не скучаем». У працэсе чытання дзеці не толькі адказвалі на пытанні і знаёміліся з новымі казачнымі героямі, але і дзяліліся ўражаннямі ад прачытаных летам казак.

Для малодшых школьнікаў у **філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** прайшла віктарына «Любимые сказки». Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе, па малюнку адгадвалі любімыя казкі і казачных персанажаў. У канцы мерапрыемства юныя чытачы на асфальце адлюстравалі любімых казачных персанажаў.

У **філіяле Багданаўская сельская бібліятэка** прайшла літаратурная гульня «Приглашаем в сказку».

У **філіяле Лахвенская сельская бібліятэка** прайшла літаратурная гульня «Чтобы было интересно и тебе, и мне, и всем». Быў праведзены займальны конкурс: хто хутчэй збярэ з пазлаў свайго героя. За ўдзел у конкурсе дзеці атрымалі салодкія прызы.

У **філіяле Бастынская сельская бібліятэка** прайшло пазнавальнае мерапрыемства - віктарына па казках «Пусть книги друзьями заходят в ваш дом». Таксама юныя чытачы прынялі ўдзел у казачнай віктарыне.

У **філіяле Палеская сельская бібліятэка** прайшла гульнявая гадзіна «Поиграем - почитаем».

Да 255-годдзя з дня нараджэння Вальтэра Скота - шатландскага пісьменніка, паэта і гісторыка, у бібліятэках ДУК «Лунінецкая РЦБС» прайшлі разнастайныя мерапрыемствы.

У філіяле **Лунінская сельская бібліятэка** прайшоў агляд літаратуры «Вальтер Скотт и его эпоха».

У **філіяле Рэдзігераўская сельская бібліятэка** праведзены вечар-партрэт «Мир Вальтера Скотта». Бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў мерапрыемства з цікавым лёсам і творчасцю Вальтэра Скота, які прысвяціў сваё жыццё не толькі літаратуры, але і гісторыі, праву і грамадскай дзейнасці.

19 жніўня 2026 года адбылася сустрэча працоўных калектываў **Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Калінковіча і філіяла Лунінецкая цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэка** з памочнікам пракурора Міцкевіч Дар'яй Уладзіміраўнай, на тэму «Ответственность за коррупционные преступления».

У **філіяле Лунінецкая цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэка** праведзены бібліякешынг (кніжныя таямніцы) «Книжное царство - дружное государство». Бібліятэкарам была праведзена гутарка аб тым, як важна экалогія ў нашым жыцці. Кожны з прысутных вырабіў для сябе карціну з

прыроднага матэрыялу, з хваёвых шышак,  з галінак пры дапамозе клеючых сродкаў і алейных фарбаў. Падчас творчай працы удзельнікі мерапрыемства чыталі на памяць ўрывак з паэмы А.С. Пушкіна «Руслан и Людмила», «У Лукоморья дуб зелёный». Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў гутарцы.

**У філіяле Бастынская сельская бібліятэка** прайшла экалагічная гадзіна «Природа. Экология. Жизнь. Будущее». У ходзе мерапрыемства дзеці спаборнічалі ў экалагічных гульнях, конкурсах: «Знаешь ли ты птиц?», «Знаешь ли ты лес?», «Лукошко цветов», «Угадай героя». Таксама дружна адказалі на пытанні экалагічнай віктарыны «Экология сказок».

У **філіяле Лахвенская сельская бібліятэка** адбылася тэматычная гутарка «Лесная аптека». Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з кніжнай выставай «Целебные силы природы», правяла віктарыну «Какие растения нас лечат»

У жніўні святкуюць тры  народных святы: Мядовы, Яблычны і Арэхавы Спас, якія сімвалізуюць праводзіны лета, збор ураджаю і пачатак восеньскай пары. Да гэтага дня ў бібліятэках ДУК «Лунінецкая РЦБС» прайшлі разнастайныя мерапрыемствы.

У чытальнай зале **Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ім. М. Калінковіча** адбыўся тэматычны майстар-клас для выхаванцаў Лунінецкага ТЦСАН. Сустрэча была прымеркавана да свята Праабражэння Гасподняга, у народзе вядомаму, як Яблычны Спас. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі пазнавальную праграму, падчас якой пазнаёмілі прысутных з гісторыяй і традыцыямі гэтага светлага свята. Кульмінацыяй сустрэчы стаў майстар-клас: удзельнікі з захапленнем стваралі тэматычныя вырабы, прысвечаныя сімвалу свята - яблыку.

У **філіяле Лунінецкая цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэка** ў рамках праекта па папулярызацыі спадчыны беларусаў праведзена інфармацыйная гадзіна «Народный праздник Яблочный Спас». Бібліятэкары падрыхтавалі для выхаванцаў ТЦСАН г. Лунінца цікавую інфармацыю пра свята, якія ёсць у народзе прыкметы на далейшае надвор'е, пазнаёміліся з павер'ямі, рытуаламі, прымаўкамі, пажаданнямі і казкамі, у якіх гаворка ідзе пра саспелы ўраджай. Таксама сталі ўдзельнікамі тэатралізаванай пастаноўкі беларускай народнай казкі «Репка».

У **філіяле Мікаэвіцкая гарадская бібліятэка** прайшла праваслаўная гадзіна «Спас собрал сегодня нас» з удзелам настаяцеля прыхода храма Стрэчання Гасподняга протаіерэя Уладзіміра Кавальчука. На мерапрыемства былі запрошаны атрымальнікі паслуг ДУ «Лунінецкі ТЦСАН» у горадзе Мікашэвічы.

У **філіяле Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** прайшла гадзіна праваслаўнай інфармацыі «Август начинается – Спасы открываются», прысвечаная тром галоўным святам адыходзячага лета. Бібліятэкар Юлія Канапацкая распавяла дзецям пра традыцыі святкавання мядовага, яблычнага і арэхавага Спасаў. Дзеці паглядзелі ролік пра народныя прыкметы жніўня, згулялі ў дыдактычную гульню «Разложи картинки», дружна адгадвалі тэматычныя загадкі і збіралі з частак мудрыя прыказкі.

У **філіяле Лунінская сельская бібліятэка** для выхаванцаў дзіцячага сада прайшла фальклорная гульня «Лето яблочко румянит».

У **філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** прайшла пазнавальная гадзіна «Яблочный спас — собрал сегодня нас» з удзелам настаяцеля Васіля Храма Святой Тройцы в. Вічын.

**27 жніўня 2026** года да 90-годдзя з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта, перакладчыка і дзяржаўнага дзеяча Генадзя Бураўкіна ў **Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. М. Калінковіча** адбылося чарговае паседжанне народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя». Супрацоўнікі бібліятэкі распавядалі біяграфію пісьменніка і правялі агляд твораў юбіляра. У выкананні удзельнікаў студыі прагучалі знакавыя творы аўтара: вершы «Край мой…», «Брэсту», «Чарнобыль», «Удзячны лёсу…» і знакамітая «Калыханка». У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся не толькі творчыя асаблівасці паэтыкі Бураўкіна, але і яго ўклад у развіццё нацыянальнай літаратуры.